BLR



Адкрый для сябе! Даследуй! Знаёмся!

# ВЫДАТНЫЯ АСОБЫ, МЕСЦЫ І ПАДЗЕІ







Латвія І Літва І Беларусь

Гэтая праграма фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

ЛАТВІЯ ЛІТВА БЕЛАРУСЬ 2014-2020
















**Адкрый для сябе, даследуй і знаёмся з выдатнымі асобамі, месцамі і падзеямі ў Латвіі, Літве і Беларусі!**

Маршрут дае магчымасць даведацца пра жыццёвы шлях выдатных асоб, важныя месцы і падзеі ў Зэмгальскім рэгіёне, Нэрэцкім краі, горадзе Екабпілсе (LV), Вільнюскім і Рокішкіскім раёнах (LT), а таксама ў Полацку і яго ваколіцах (BLR). Завітаўшы ў памятныя мясціны, госці змогуць пазнаёміцца са спадчынай выдатных асоб – пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, лекараў, першых дзяржаўных дзеячаў Латвіі, а таксама «бацькі» латышскага тэатра, заснавальнікаў літоўскага мастацтва, і беларускага асветніка.
У маршрут уключаны музеі, цэрквы, паркі і іншыя цікавыя славутасці, якія дазволяць падарожнікам пазнаёміцца са спадчынай, якой ганарацца мясцовыя жыхары.
Напрыклад, геадэзічная дуга Струвэ, якая перасякае 10 краін, мае сусветную гістарычную каштоўнасць, з'яўляецца ўнікальнай сістэмай геадэзічных вымярэнняў XIX стагоддзя для вызначэння памераў і формы Зямлі і лічыцца адной з самых грандыёзных кампаній па геадэзіі ў гісторыі чалавецтва.
У 2005 годзе дуга Струвэ ўвайшла ў спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, куды былі таксама ўключаны 34 яе пункты. Маршрут праходзіць праз чатыры такія пункты: адзін у Латвіі, у горадзе Екабпілсе, і яшчэ тры ў Літве – у Вільнюскім і Рокішкіскім раёнах. Акрамя таго, на гэтым маршруце можна будзе наведаць два еўрапейскія геаграфічныя цэнтры, адзін з якіх знаходзіцца ў Вільнюскім раёне, а другі – у горадзе Полацку.

**Знаёмся з выдатнымі асобамі, месцамі і падзеямі, якія пакінулі глыбокі след у гісторыі суседніх народаў!**

## Змест

Уводзіны .......... 3

Зэмгальскі рэгіён, Латвія .......... 4
Горад Екабпілс, Латвія .......... 5
Карта аб'ектаў агляду .......... 14
Нэрэцкі край, Латвія .......... 18

Рокішкіскі раён, Літва .......... 19
Вільнюскі раён, Літва .......... 21

Горад Полацк і Полацкі раён, Беларусь .......... 24




## Абазначэнні

Для наведвання патрабуецца папярэдняя заяўка!

Для наведвання груп патрабуецца папярэдняя заяўка!

Для ўдзелу ў праграмах, майстар-класах патрабуецца папярэдняя заяўка!

Бліжэйшы да аб'ектаў турыстычны інфармацыйны цэнтр / пункт / пастаўшчык інфармацыі.

# ЗЭМГАЛЬСКІ РЭГІЁН

ЛАТВІЯ

1

## Музей Райніса «Tadenava»

Некранутая латвійская прырода Тадэнавы, напоўненая сонечным святлом, на ўсё жыццё стала крыніцай натхнення паэта, драматурга, палітыка, перакладчыка, аднаго з самых яркіх прадстаўнікоў інтэлігенцыі Латвіі XX ст. Райніса, або Яніса Пліекшанса (1865-1929). Райніс з'яўляецца аўтарам такіх твораў, як «Залаты конь», «Ветрык, вей!», зборніка вершаў «Залатое сіта» і іншых, вядомых кожнаму латышу. Акрамя таго, ён быў палкім прыхільнікам і прапагандыстам ідэі аб незалежнай Латвіі. Райніс актыўна займаўся палітычнай дзейнасцю, працаваў у Канстытуцыйным сходзе, Сейме і нават прэтэндаваў на пасаду прэзідэнта. У бацькоўскім доме Райніса пануе адмысловая атмасфера. Праз гульню, з дзіцячай лёгкасцю, тут можна даведацца пра першыя гады жыцця Райніса, пазнаёміцца з яго літаратурнай спадчынай. Экспазіцыя без лічбавых элементаў дазваляе забыцца на штодзённую спешку і аддацца зачараванню навакольнай прыроды, шчырасці і летуценнасці светлага дзяцінства.

Тадэнава, Дунаўская воласць, Екабпілскі край, Латвія
56.176500, 26.114000

www.aspazijarainis.lv/tadenava
+371 29250484

www.jekabpilsnovads.lv
www.muzejsselija.lv

2

## Парк Аляксандраса Грынаса

Гэта радзіма і месца, дзе прайшло дзяцінства пісьменніка, публіцыста і афіцэра Латвійскай арміі Аляксандраса Грынаса (1895-1941), аўтара раманаў «Пярсцёнак Намея» і «Аднаўляльнікі зямлі». Свой эпічны раман «Душы ў снежнай віхуры» аўтар напісаў на аснове ўбачанага і перажытага.




Гэты твор стаў яркім адлюстраваннем вырашальных для Латвійскай дзяржавы падзей Першай сусветнай вайны і баявога духу самаахвярных стралкоў. Акрамя таго, у 2019 годзе, калі адзначалася стагоддзе барацьбы за свабоду, па матывах рамана знялі мастацкі фільм. У парку размешчаны шырокафарматныя аб'екты, прысвечаныя творчасці пісьменніка: сілуэты стралкоў, трохвугольнікі з латышскімі этнаграфічнымі знакамі, садовая брама, выява мядзведзя з адбіткам лапы і іншыя. У будынку «Дактарата» знаходзіцца мемарыяльны пакой, дзе размешчана цікавая інфармацыя пра жыццё пісьменніка.

«Doktorāts», Калнская воласць, Екабпілскі край, Латвія
56.351035, 25.819854

www.jekabpilsnovads.lv
+371 29939759



3

## Школа Паўлса Страдыньша

Школа Паўлса Страдыньша – гэта філіял Віесіцкага музея «Селія», які знаёміць наведвальнікаў з дзвюма важнымі сем'ямі ў Латвіі – сям'ёй Страдыньшаў і Стэндэрсаў. У Віесітэ нарадзіўся прафесар Паўлс Страдыньш (1896–1958) – выдатны латышскі ўрач, хірург. Сваё жыццё ён прысвяціў развіццю медыцыны, дзякуючы чаму яго імя стала вядомым не толькі ў Латвіі, а і за яе межамі. Стэндэрс Старэйшы (Готард Фрыдрых Стэндэрс, 1714–1765) – латышскі пісьменнік нямецкага паходжання, мовазнавец, пастар, асветнік, лічыцца заснавальнікам латышскіх традыцый свецкай літаратуры. Створаная ім «Ілюстраваная азбука» стала першым выданнем такога тыпу на латышскай мове і з'яўляецца прыкладам творчага падыходу да вывучэння алфавіта: да кожнай літары пададзена ілюстрацыя і прыведзена двухрадкоўе. У музеі знаходзіцца сямейная гасцёўня Страдыньшаў, рабочы кабінет прафесара Паўлса Страдыньша, а ў медпункце можна ўбачыць сельскія медыцынскія інструменты. У кабінеце Стэндэрса знаходзіцца копія ўнікальнай прылады XVIII ст. – пральная машына, якую зрабіў паводле апублікаваных чарцяжоў Стэндэрса Эдвінс Гуршпонс, майстар па вырабе спартыўных санак.

вул. Пэлду, 2, Віесітэ, Віесіцкі край, Латвія
56.348319, 25.552511

www.muzejsselija.lv
+ 371 29116334

**Далейшую інфармацыю пра турыстычныя аб'екты Зэмгальскага рэгіёна глядзіце на старонцы 7.**

# ГОРАД ЕКАБПІЛС

ЛАТВІЯ




4

## Музей гісторыі Екабпілса

Музей знаходзіцца ў Крустпілскім замку, адным з найстарэйшых замкаў Латвіі. У 1237 годзе архіепіскап Рыжскі Мікалай Магдэбургскі загадаў пабудаваць гэты замак як умацаванне на шляху з Рыгі ў Даўгаўпілс. У суправаджэнні гіда можна пазнаёміцца з гісторыяй замка, пастаяннай экспазіцыяй, паглядзець на інтэр'ер аднаўленага замка, даведацца шмат цікавага пра знакамітых асоб і падзеі Екабпілса, самастойна азнаёміцца з новай экспазіцыяй, прысвечанай гісторыі горада. Музей прапануе адукацыйныя праграмы, а таксама інтэрактыўны мультымедыйны «Гаворачы стэнд», дзе прывід замка – Карычневая дама – расказвае пра падзеі розных часоў. Віртуальная рэальнасць дае магчымасць апынуцца ў замку канца XIX ст., адчуць яго атмасферу і зрабіць фотаздымкі на памяць.

вул. Рыгас, 216В, Екабпілс, Екабпілскі край, Латвія
56.512001, 25.857500

www.jekabpilsmuzejs.lv
+371 27008136

5

## Свята-Духаўская праваслаўная царква і мужчынскі манастыр

Манастыр быў пабудаваны ў візантыйскім стылі ў другой палове XIX ст. У 2008 годзе ў царкву вярнулася копія цудадзейнага абраза Маці Божай Якабштацкай, які сотні гадоў вяртае здароўе хворым і штогод збірае вялікую колькасць паломнікаў. Царква і манастыр утвараюць найстарэйшы ў Латвіі праваслаўны культавы комплекс; за ахвяраванне госці могуць агледзець яго знутры. На тэрыторыі комплекса знаходзіцца царква Святога Мікалая Цудатворца, унікальная сваімі мініяцюрнымі памерамі: 17x19,5 м. Мікалай Цудатворац, ці Святы Мікалай, – хрысціянскі святы, архіепіскап Мір Лікійскіх у Візантыі пачатку IV стагоддзя. Увесь комплекс акружаны моцным мурам, нехарактэрным для гарадскога асяроддзя Латвіі XVII стагоддзя.

вул. Брывібас, 200, Екабпілс,
Екабпілскі край, Латвія
56.500198, 25.860500
www.jekabpils.lv
+371 65231486







www.jekabpils.lv






6

## Пункт геадэзічнай дугі Струвэ «Екабпілс»

У 2005 годзе дуга Струвэ была ўнесена ў спіс аб’ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА як унікальная, найдаўжэйшая і найдакладнейшая на момант стварэння сістэма геадэзічных вымярэнняў, якую выкарыстоўвалі для вызначэння памераў і формы Зямлі. Яна з’яўляецца выдатным сведчаннем навукова-тэхнічнага развіцця свайго часу. На тэрыторыі Латвіі былі адзначаны 16 пунктаў, два з якіх – у Екабпілсе і Сэтукалнсе – уключаны ў спіс аб’ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.
У парку Струвэ знаходзіцца пункт, дзе ў 1826 годзе рабіў замеры акадэмік, прафесар Тартускага ўніверсітэта, астраном і геадэзіст, першы дырэктар Пулкаўскай абсерваторыі Фрыдрых Георг Вільгельм Струвэ (1793–1864); таксама тут можна ўбачыць памятны камень, устаноўлены ў гонар знакамітага вучонага.

вул. Струвэ, Екабпілс,
Екабпілскі край, Латвія
56.501301, 25.856160
www.jekabpils.lv
+371 25905256




## Зэмгальскі рэгіён

7 8

## Мемарыяльны пакой і альтанка Петэрыса Барысонса

Таленавіты латышскі кампазітар і дырыжор Петэрыс Барысонс (1904–1947) адыграў значную ролю ў развіцці латышскай музыкі: ён кіраваў харавымі калектывамі, быў дырыжорам Нацыянальнай оперы. Адна з самых вядомых яго работ – песня «У песні сёння вялікі дзень», якая гучыць на адкрыцці значнага для Латвіі Усеслатвійскага свята песні. Асабістыя рэчы кампазітара, музычныя інструменты, дакументы і многае іншае можна ўбачыць у яго родным доме «Skudras».

У альтанцы ў прысядзібным парку Вігантэ на некалькіх стэндах размешчана інфармацыя пра кампазітара, яго творчасць і традыцыі Свята песні. Акрамя таго, тут можна даведацца пра найбольш значныя прыродныя аб’екты парку Вігантэ (скала Стабурагс, крыніца Ліепаватс), якія пасля будаўніцтва Плявіньскай ГЭС у 1965 годзе і павышэння ўзроўню вады ў рацэ разам з эстрадай Свята песні зараз знаходзяцца на дне Даўгавы. У гэтай альтанцы таксама можна выбраць і паслухаць адну з кампазіцый Петэрыса Барысонса.

«Skudras», Стабурагская воласць,
Яўн’елгаўскі край, Латвія
56.554573, 25.571753
www.jaunjelgava.lv
+371 22381401

«Vīgante», Стабурагская воласць,
Яўн’елгаўскі край, Латвія
56.5741969, 25.4955651
www.jaunjelgava.lv
+371 29892925

www.jaunjelgava.lv

9

### Мемарыяльны дом скульптара Валдэмарса Якабсонса

Драўляны svіран, пабудаваны для патрэб Вэцбэбрскай сядзібы, сёння стаў адзіным у Латвіі мемарыяльным домам мастака, які пайшоў сваім шляхам у гісторыі латвійскай скульптуры. «Мой свіран – мой рай», – гаварыў скульптар Валдэмарс Якабсонс (1899–1974) – настаўнік, чэмпіён па боксе і еўрапейскі падарожнік, свайго роду самотнік і аскетык. У свіране «Galdiņi» долаты, малаткі, лыжы, лапці, магутныя лыжныя чаравікі, кнігі, скульптуры жывуць сваім жыццём. Работы скульптара аб'ядноўвае па-сялянску цэласнае ўспрыманне прыроды і жыцця, сапраўды латышскае і па-паўночнаму суровае. Бронза, чыгун, граніт, даламіт, цэмент, гіпс, гліна ўпэўнена кранутыя долатам скульптара. Трэба проста адчыніць дзверы свірана як браму і пачаць чытаць: «Кукажыня», «Гаспадыня», «Дзяўчына з народа» і яшчэ больш за 50 увасобленых персанажаў, а таксама мноства малюнкаў і графічных работ.

«Galdiņi», Бэбрская воласць,
Кокнэскі край, Латвія
56.723549, 25.489342

www.visitkoknese.lv
+371 27294969

10

### Мемарыяльны дом-музей пісьменніка А. Упіта

Музей знаёміць з асобай пісьменніка Андрэя Упіта (1887–1970) і яго творчым шляхам, а таксама працягам устаноўленых ім традыцый у нашы дні. Андрэй Упіт – аўтар твораў, якія чытаюць людзі розных пакаленняў: «Хлопчыкі сяла Замшэлага», «Зялёная зямля», «На мяжы стагоддзяў», якія дазваляюць адчуць і зразумець не толькі эканамічную і палітычную, але і культурна-гістарычную атмасферу ў Латвіі. У музеі можна па адным, парамі ці групамі складзі выказванні А. Упіта, адправіцца ў экспедыцыю па распазнаванні дрэў. Акрамя таго, у Скрывэры наведвальнікі змогуць убачыць месцы, якія ўзгадваюцца ў рамане «Зялёная зямля», як у музейнай экспазіцыі, так і падчас прагулкі па навакольных прыродных сцежках.

вул. Даўгавас, 58, Скрывэры,
Скрывэрскі край, Латвія
56.641551, 25.115776

https://visit.skriveri.lv
+371 29496725







11

### Музей Калядных баёў «Mangaļi»

Музей прапануе экспазіцыю, прысвечаную легендарным Калядным баям латышскіх стралкоў падчас Першай сусветнай вайны. На тэрыторыі музея захаваліся ўнікальныя элементы палявых умацаванняў Першай сусветнай вайны: участак фартыфікацыйнай сістэмы, рэканструяваны ў аўтэнтычным месцы, – бліндаж і частка першай лініі нямецкай абароны – «нямецкі вал», які з'яўляецца адзіным аб'ектам такога роду ў краінах Балтыі. У музеі экспануецца больш за 200 фотаздымкаў, схемы баёў, прадметы, знойдзеныя ў ваколіцах Тырэльпурвы, а таксама найбуйнейшы ў Латвіі макет мясцовасці, дзе вяліся баі. У суправаджэнні гіда можна прагуляцца па музеі і прыняць удзел у адукацыйных мерапрыемствах, пазнаёміцца з падзеямі ваеннага часу і штодзённым жыццём салдат.

«Mangaļi», Валгундская воласць,
Елгаўскі край, Латвія
56.829899, 23.701973

www.karamuzejs.lv
+371 67228147













www.visitkoknese.lv
https://visit.skriveri.lv
www.visit.jelgava.lv

12

## Мемарыяльны музей Карліса Улманіса «Pikšas»

Карліс Улманіс (1877–1942) – адзін з заснавальнікаў Латвійскай дзяржавы, першы прэм’ер-міністр, а пазней – прэзідэнт Латвіі. Музей створаны на месцы яго роднага дома. У савецкія гады ўсе будынкі былі знесены, а сядзіба разбурана, аднак у гады Трэцяга нацыянальнага абуджэння па ініцыятыве людзей будынкі былі





адноўлены. У «Pikšas» можна азнаёміцца з экспазіцыяй, прысвечанай жыццю вядомага дзяржаўнага дзеяча, яго ідэям і ролі ва ўмацаванні дзяржаўнасці. На прасторным падворку «Pikšas» можна ўбачыць архітэктуру зэмгальскай сядзібы 30-х гадоў XX ст., а таксама атрымаць разнастайную інфармацыю пра ранейшыя сельскагаспадарчыя прылады працы і прадметы побыту.

«Pikšas», Берзская воласць,
Добельскі край, Латвія
56.659542, 23.482973

www.piksas.lv
+371 26670812

13

## Садаводчы музей імя Петэрыса Упіціса

Музей прапануе пазнаёміцца з магутнай асобай аднаго з самых выдатных селекцыянераў Латвіі Петэрыса Упіціса (1896–1976). Экспазіцыя музея дае ўяўленне пра пачатак прафесійнага садаводства ў Добэлэ і пра спадчыну, пакінутую выдатным садаводам.

Тут можна наведаць вялікі сад, пазнаёміцца з напрамкамі даследаванняў, генафондам латвійскіх пладовых дрэў і калекцыяй традыцыйнай агародніны, адправіцца на адукацыйныя экскурсіі. Музей і сад – значная для Латвіі культурная прастора, дзе з даўніх часоў фарміравалася сінергія паміж навукай і мастацтвам. Таму і ў нашы дні штогод падчас цвіцення найбуйнейшай у Еўропе калекцыі бэзу ў гасцей ёсць унікальная магчымасць наведаць разнастайныя культурныя мерапрыемствы.





вул. Граўду, 1, Цэрыні, Крымунская воласць,
Добэльскі край, Латвія
56.610852, 23.297054

www.darzkopibasinstituts.lv
+371 26408655



14

## Музей Ганны Брыгадэрэ «Sprīdīši»

«Sprīdīši» – месца, дзе працавала і адпачывала знакамітая латвійская пісьменніца Ганна Брыгадэрэ (1861–1933). Тут яна напісала шмат выдатных твораў, у тым ліку трылогію ўспамінаў «Бог. Прырода. Праца». Па мясцінах дзяцінства пісьменніцы, апісаных ёй у творы, можна прагуляцца і сёння. Творы Ганны Брыгадэрэ, вядомыя і любімыя кожным латышом,




даюць уяўленне пра латышскі лад жыцця, таму яны ўключаны ў школьную праграму. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца створаныя пісьменніцай казачныя п’есы, якія неаднаразова ставіліся ў латвійскіх тэатрах раней і сёння, даюць гледачам разуменне асноўных жыццёвых каштоўнасцей. Самыя яркія персанажы твораў можна знайсці ў прылеглым прыродным парку ў Тэрвэтэ. У музеі можна пазнаёміцца з жыццём і творчасцю Ганны Брыгадэрэ, зазірнуць у некалькі жылых пакояў дома і ўбачыць яе калекцыю кніг.

«Sprīdīši», Тэрвэцкая воласць,
Тэрвэцкі край, Латвія
56.483378, 23.376374

www.spridisi.lv
+371 26532691

www.dobele.lv
www.tervetesnovads.lv






## 15 Маёнтак Гедэрта Эліяса «Zīlēni»

Гедэрт Эліяс (1887–1975) – адзін з самых выдатных латышскіх жывапісцаў – прадстаўнік рэалізму, даследчык гісторыі мастацтва, выкладчык. Мастак нарадзіўся на хутары «Zīlēni», які знаходзіцца ў маляўнічым месцы на беразе ракі Платоне. Каля дома расце самы вялікі ясень у краінах Балтыі. Невялікая экспазіцыя ў «Zīlēni» знаёміць з сям'ёй Эліясаў: братамі Крыстапам, Гедэртам і Юрысам, сястрой Маей, якія былі значнымі творчымі і грамадскімі асобамі. Наведвальнікі маюць магчымасць убачыць серыю рэпрадукцый карцін мастака і даведацца пра гісторыю сям'і. Акрамя таго, тут праходзяць культурныя і мастацкія мерапрыемствы.

«Zīlēni», Покі, Платонская валасць, Елгаўскі край, Латвія
56.503083, 23.670339
www.visit.jelgava.lv
+371 26547117

## 16 Мемарыяльны музей Адольфа Алунана

Адольф Алунан (1848–1912) – заснавальнік латышскага тэатра, першы прафесійны акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч, драматург, педагог і папулярызатар тэатральнага мастацтва. За гэтыя заслугі латышскі народ назваў яго «бацькам тэатра». Елгава – родны горад Алунана, дзе прайшлі яго дзіцячыя і школьныя гады;






тут, у нямецкім тэатры, маленькі Адольф пазнаёміўся з гэтым відам мастацтва і палюбіў яго. Музей знаходзіцца ў доме, дзе «бацька тэатра» правёў апошнія два гады свайго жыцця, а яго сям'я жыла там да 1926 года. Тут захоўваецца яго творчая спадчына, бібліятэка, мэбля і прадметы побыту, якія нагадваюць пра рамантыку пачатку XX ст. і ствараюць рэальную атмасферу, у якой жыў «бацька» латвійскага тэатра.

вул. Філазофу, 3, Елгава, Латвія
56.644300, 23.710347
www.alunans.lv
+371 63021180




## 17 Елгаўскі гісторыка-мастацкі музей імя Гедэрта Эліяса

Будынак музея, які вядомы пад гістарычнай назвай *Academia Petrina*, пабудаваны ў 1775 годзе па ініцыятыве апошняга герцага Курляндыі і Зэмгалэ Пятра Бірона на месцы былой гарадской рэзідэнцыі герцагаў. Тут размяшчалася першая на тэрыторыі Латвіі вышэйшая навучальная ўстанова, у якой калісьці вучыліся першыя прэзідэнты Літвы і Латвіі – Антанас Смятона, Яніс Чакстэ і Альберт Квієсіс. У наш час у будынку створаны музей, дзе размешчаны інтэрактыўныя экспазіцыі, якія пры дапамозе 3D-акуляраў пазнаёмяць наведвальнікаў з гісторыяй Елгавы і Елгаўскага краю, раскажуць пра значныя гістарычныя падзеі ад самых ранніх часоў да нашых дзён. Найбольшую каштоўнасць у калекцыі музея мае збор твораў класіка, прадстаўніка рэалістычнага жывапісу, выдатнага латышскага мастака Гедэрта Эліяса (1887–1975).

вул. Акадэміяс, 10, Елгава, Латвія
56.649892, 23.728888
www.jvmm.lv
+371 63023383

## 18 Вежа Елгаўскай царквы Святой Тройцы

Цяперашняя званіца Елгаўскай царквы Святой Тройцы першапачаткова была часткай царквы, пабудаванай у 1574 годзе па загадзе герцага Курляндыі і Зэмгалэ Готарда Кетлера. Гэта была першая новаўзведзеная лютэранская каменная царква ў Еўропе і самая вялікая царква ў Зэмгалэ. Пасля разбурэння касцёла ў 1944 годзе яго больш не аднавілі, але званіца захавалася. У 2010 годзе пасля маштабных рэканструкцыйных работ вежа адрадзілася ў новым выглядзе і сёння мае дзевяць паверхаў, на якіх размешчаны тры сучасныя інтэрактыўныя гістарычныя экспазіцыі. Адна з іх – «Зэмгалэ – калыска латвійскіх прэзідэнтаў» – распавядае пра першых чатырох прэзідэнтаў Латвіі: Яніса Чакстэ, Густава Земгалса, Альбертса Квіесіса і Карліса Улманіса, жыццё і дзейнасць якіх цесна звязана з Елгавай і Зэмгалэ. Каля вежы знаходзіцца помнік першаму прэзідэнту Латвіі Янісу Чакстэ, які нарадзіўся ў ваколіцах Елгавы, тут вучыўся і працаваў.

вул. Акадэміяс, 1, Елгава, Латвія
56.652443, 23.728838
www.visit.jelgava.lv
+371 63005445

www.visit.jelgava.lv


Латвія
Літва
Беларусь
RĪGA
VILNIUS
Latvija
Jelgava
Jēkabpils
Rokiškis
Daugavpils
Šiauliai
Panevėžys
Kaunas
Полацк
Talsi
Saulkrasti
Cēsis
Sigulda
Sabile
Tukums
Jūrmala
Salaspils
Ogre
Olaine
Madona
Vecbebri
Koknese
Skrīveri
Aizkraukle
Pļaviņas
Biksti
Dobele
Ozolnieki
Vecumnieki
Iecava
Staļģene
Valle
Auce
Tērvete
Eleja
Pilsrundāle
Bauska
Skaistkalne
Žagarė
Ērberģe
Viesīte
Sala
Vipe
Līvāni
Zasa
Aknīste
Nereta
Tadenava
Kaldabruņa
Atašiene
Viļāni
Rēzekne
Ludza
Preiļi
Krāslava
Akmenė
Joniškis
Žeimelis
Lauksodis
Papilė
Biržai
Pasvalys
Juodupė
Obeliai
Kamajai
Kupiškis
Kriaunos
Pakruojis
Gaulėnai
Radviliškis
Šiaulėnai
Kelmė
Kražiai
Upytė
Zarasai
Dusetos
Užpaliai
Visaginas
Anykščiai
Utena
Tauragnai
Ignalina
Raseiniai
Kėdainiai
Ukmergė
Molėtai
Švenčionys
Jurbarkas
Meškonys
Girija
Maišiagala
Nemenčinė
Pričiūnai
Kazlų Rūda
Vilkaviškis
Prienai
Birštonas
Trakai
Nemėžis
Paliepiukai
Bareikiškės
Juodšiliai
Medininkai
Marijampolė
Kalvarija
Alytus
Šalčininkai
Верхнядзвінск
Клясціцы
Краснаполле
Браслаў
Міёры
Дзісна
Навaполацк
Палата
Опса
Шаркаўшчына
Казьяны
Празарокі
Бікульнічы
Мішнevічы
Гарадок
Обаль
Ула
Ушачы
Глыбокае
Пастаvы
Лынтупы
Бешанковічы
Бароўка
Лепель
Нарач
Мядзел
Докшыцы
Альхоўка
Сянно
Бягомль
Новалукомль
Смаргонь
Вілейка
Ашмяны
A1
A2
A4
A5
A6
A7
A8
A9
A10
A11
A12
A13
A14
A16
E22
E67
E77
E85
E262
E272
P3
P14
P20
P27
P45
P46
M1
M3
M8
1
2
3
4
5
6
7
8
9
10
11
12
13
14
15
16
17
18
19
20
21
22
23
24
25
26
27
28
29
30
31
32
33
34
35
36
37
38
39
40
41
Riga
Vilnius
Мінск
Латвія
Літва
Беларусь
Зэмгальскі рэгіён
Нэрэцкі край / Горад Екабпілс
Рокішкіскі раён / Вільнюскі раён
Горад Полацк і Полацкі раён




## 19 Дом Яніса Чакстэ

На беразе ракі Ліелупэ знаходзіцца родны дом «Auči» першага прэзідэнта Латвіі Яніса Чакстэ (1859–1927). Будынак, узведзены ў 30-х гадах XX ст., з 1995 года зноў належыць роду Чакстэ, зараз там жыве яго сям'я. У аднаўленым доме для слуг можна паглядзець экспазіцыю, якая ў сучасным фармаце распавядае пра лёс першага прэзідэнта Латвіі і яго сям'і ў кантэксце гісторыі і развіцця дэмакратыі ў Латвіі. Місія дома Яніса Чакстэ – даць кожнаму магчымасць адкрыць асабіста для сябе асобу першага прэзідэнта Латвіі, яго шлях да гэтай пасады і заахвоціць наведвальнікаў пераняць яго ідэі аб свабоднай, незалежнай і дэмакратычнай Латвіі.

«Auči», Салгальская валасць,
Озалніекскі край, Латвія
56.594676, 23.957577
www.visit.jelgava.lv
+371 26392154




## 20 Мемарыяльны дом Эдвартса Вірзы і Эльзы Стэрстэ «Billītes»

Латышскі паэт, празаік і перакладчык Эдвартс Вірза (1883–1940) і яго жонка, паэтэса і настаўніца Эльза Стэрстэ (1885–1976), шмат гадоў жылі ў «Billītes», дзе з'явілася шмат іх вершаў. У 1933 годзе Э. Вірза напісаў паэму «Страўмены», якая з'яўляецца самым выдатным творам пра жыццё латышскіх сялян. У наш час у «Billītes» створаны мемарыяльны музей, які распавядае пра жыццё паэтаў і іх найбольш вядомыя творы – «Страўмены» і паэтычны зборнік Э. Стэрстэ «Заблытаныя ніці».

«Billītes», Салгальская валасць,
Озалніекскі край, Латвія
56.575028, 24.109230
www.visit.jelgava.lv
+371 29299790







## 21 Музей В. Плудоніса

Віліс Плудоніс (1874–1940) – выдатны латышскі паэт і настаўнік, літаратурная спадчына якога мае вялікае значэнне для Латвіі. І дарослыя, і дзеці ведаюць верш «Заячая лазенька», які з'яўляецца своеасаблівым успамінам пра дзяцінства. Экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці паэта, даступная для наведвальнікаў у жылым будынку музея, аднаўленым свіране і гаспадарчых пабудовах, а каля Заячай лазенькі гасцей чакаюць драўляныя скульптуры заячай сям'і. Для школьнікаў музей прапануе маладзёжныя педагагічныя праграмы для больш глыбокага знаёмства з асобай паэта і яго літаратурнай спадчынай. У музеі таксама працуюць творчыя майстэрні, дзе можна зрабіць калядных павукоў, саламяныя сонейкі і віншавальныя паштоўкі з латышскімі этнаграфічнымі знакамі.

«Lejenieki», Цэраўкцкая валасць,
Баўскі край, Латвія
56.410972, 24.293848
www.bauskasmuzejs.lv
+371 26184631

## 22 Музей акцёраў Амтманісаў

У будынку, дзе знаходзіцца музей, калісьці жылі акцёр і рэжысёр Альфрэд Амтманіс-Брэдытыс (1885–1966) і яго брат, таксама акцёр і рэжысёр, Тэадор Амтманіс (1883–1938) – выдатныя таленавітыя майстры латышскага тэатра, якія паходзяць з простай сям'і з невялікай сельскай валасці. Браты Амтманісы былі аднымі з першых, хто ўдасканаліў манеру сапраўды псіхалагічнай ігры ў латышскім тэатры. Пастаянная экспазіцыя музея знаёміць наведвальнікаў з сем'ямі знакамітых дзеячаў, іх жыццёвым шляхам і дасягненнямі ў развіцці тэатральнага мастацтва.

«Zvanītāju Bukas», Вальская валасць,
Вэцумніекскі край, Латвія
56.506689, 24.716086
www.vecumnieki.lv
+371 26608478




www.visit.jelgava.lv
www.visit.bauska.lv

# НЭРЭЦКІ КРАЙ



ЛАТВІЯ

23

### Музей Яніса Яўнсудрабіньша «Riekstiņi»

Яніс Яўнсудрабіньш (1877–1962) – мастак, паэт, пісьменнік. Яго «Белая кніга» – адзін з самых выдатных і папулярных твораў латышскай літаратуры, уключаны ў Культурны канон Латвіі і ў спіс абавязковай літаратуры для школ. Музей пісьменніка знаходзіцца ў доме яго дзяцінства, апісаным у «Белай кнізе». Тут захавалася непаўторная атмасфера «Mūsmājas» – хата, павеці, векавыя дрэвы і пейзажы.
У экспазіцыі музея прадстаўлены кнігі, фотаздымкі, карціны і асабістыя рэчы Яніса Яўнсудрабіньша. Акрамя таго, гасцям прапануюцца займальныя этнаграфічныя праграмы і майстар-класы, напрыклад, «Хлеб надзённы сам прыйдзе», паўдзельнічаць у якіх могуць наведвальнікі рознага ўзросту.

«Riekstiņi», Нэрэцкая валасць,
Нэрэцкі край, Латвія
56.196972, 25.379686

www.neretasnovads.lv
+371 65176467







www.neretasnovads.lv







# РОКІШКІСКІ РАЁН



ЛІТВА







24

### Музей Рокішкіскага краю

Гэта першы музей у Літве, заснаваны ў маёнтку. Яму належаць 16 захаваных аўтэнтычных будынкаў, парк плошчай у 28,1 га і сажалкі. У палацы гасцей чакае знаёмства са спадчынай графаў Тызенгаўзаў і Пшаздзецкіх, найбагацейшымі скарбамі гісторыі і культуры. Толькі тут можна ўбачыць унікальную экспазіцыю твораў вядомага літоўскага разьбяра XX ст. Лёнгінаса Шэпкі (1907–1985) і адзіную ў Літве калекцыю шопак. Дух мінуўшчыны можна адчуць, прымаючы ўдзел у адукацыйных мерапрыемствах («Шлях сыру», «Адліўка свечак», «Выраб бронзавых ўпрыгажэнняў селаў» і інш.).

вул. Тызенгаўзу, 5, Рокішкіс, Літва
55.965382, 25.600904

www.muziejusrokiskyje.lt
+370 61544586







25

### Касцёл Св. Апостала Мацвея ў Рокішкісе

Гэта адзін з самых значных будынкаў неагатычнага стылю, пабудаваны ў эпоху гістарызму ў Літве. Пачатак будаўніцтва датуецца 1868 г. Гэта ці не адзіная ў Літве пабудова XIX ст., спраектаваная і выкананая замежнымі архітэктарамі, мастакамі і майстрамі найвышэйшай кваліфікацыі. Наведвальнікі могуць агледзець крыпту бажніцы, дзе пахаваныя фундатары касцёла – графы Тызенгаўзы, палюбавацца панарамай Рокішкіса з касцёльнай вежы, наведаць музей царкоўных каштоўнасцей, якія знаходзіцца ў графскай ложы.

пл. Непрыклаўсамібес, 1, Рокішкіс, Літва
55.964477, 25.585005

www.rokiskioparapija.lt
+370 68758342

26

### Парк скульптуры Лёнгінаса Шэпкі ў горадзе Рокішкісе

Каб ушанаваць памяць славутага літоўскага разьбяра Лёнгінаса Шэпкі (1907–1985), у горадзе Рокішкісе створаны парк драўлянай скульптуры. Скульптуры для гэтага парку выразаюцца з 2001 года. Вядомыя літоўскія разьбяры падрыхтавалі больш за 70 скульптур і скульптурных кампазіцый, у стварэнні парку прымалі ўдзел таксама разьбяры з Латвіі і Беларусі. Аўтары скульптур імправізавалі на тэмы жыцця і творчасці Шэпкі, імкнучыся як мага болей раскрыць сваю творчую індывідуальнасць.

вул. Тайкос, Рокішкіс, Літва
55.953937, 25.584035

www.rokiskiotic.lt
+370 68758342



27

### Пункт геадэзічнай дугі Струвэ ў Гірэйшэі

Пункт геадэзічнай дугі Струвэ знаходзіцца ў вёсцы Гірэйшэй, пры аўтастрадзе 122 Даўгаўпілс–Купішкіс–Панявежыс. Гэты трыянгуляцыйны ланцуг быў створаны ў 1816–1852 гадах у выніку спроб вызначыць памер і форму Зямлі. Гэта адзін з трох геадэзічных пунктаў на тэрыторыі Літвы, якія ўваходзяць у спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Для наведвальнікаў тут абсталявана назіральная пляцоўка і інфармацыйны стэнд.

вёска Гірэйшэй, староства Панямунеляй, Рокішкіскі раён, Літва
55.902493, 25.436630

www.rokiskiotic.lt
+370 45851044



28

### Мемарыяльны музей мастака Юсцінаса Венажынскіса ў Дачунаі

Дзяцінства і юнацтва аднаго з найвыдатнейшых літоўскіх мастакоў, класіка жывапісу Юсцінаса Венажынскіса (1886-1960) прайшло ў Дачунай, непадалёк ад мястэчка Абялей, дзе пазней была напісана значная частка твораў мастака: краявіды бацькаўшчыны і яе ваколіц, партрэты бацькоў і блізкіх. Мастак заклаў падмурак прафесійнай мастацкай школы ў Літве. У яго родHай сядзібе, дзе захавалася аўтэнтычная архітэктура жылога дома XIX ст., працуе мемарыяльная экспазіцыя.

вул. Юстына Віенажыскё, 28А, Аўдроніс І, староства Абялей, Рокішкіскі раён, Літва
55.942075, 25.746271

www.rokiskiotic.lt
+370 60648033

www.rokiskiotic.lt

# ВІЛЬНЮСКІ РАЁН




29 34

### Геадэзічныя пункты дугі Струвэ ў Мешконісе і Палепюкаі

Геадэзічная дуга Струвэ працягласцю 2820 кіламетраў ілюструе ўнікальныя дасягненні ў развіцці навук аб Зямлі і тапаграфічным картаграфаванні. Гэты буйны праект быў рэалізаваны ў XIX ст. Яго мэтай стала максімальна дакладнае вывучэнне памераў і формы планеты Зямля! У 2005 годзе геадэзічная дуга Струвэ ўключана ў спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў рамках Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны. Тры з 34 пунктаў геадэзічнай дугі Струвэ знаходзяцца ў Літве, два з іх можна наведаць – побач з імі размешчаны слупкі і інфармацыйныя стэнды пра дугу Струвэ.

Мяшконіс, Нямянчынскае староства, Вільнюскі раён, Літва
54.930959, 25.316731

Палепюкай, Нямежыскае староства, Вільнюскі раён, Літва
54.634440, 25.429183

www.vrtic.lt
+370 52436402

30

## Геаграфічны цэнтр Еўропы

У 1989 годзе даследчыкі з Нацыянальнага геаграфічнага інстытута Францыі выявілі, што сапраўдны геаграфічны цэнтр Еўропы знаходзіцца ў Літве, паміж вёскамі Пурнушкес і Бярнотай. Геаграфічны цэнтр Еўропы абазначаны мемарыяльным каменем, сцягамі дзяржаў-



членаў Еўрапейскага Саюза і белай гранітнай калонай, упрыгожанай каронай з зорак. Побач знаходзіцца адзін з самых старажытных курганоў – Бярнотай, а таксама гольф-клуб Цэнтра Еўропы.

вёска Гірыя, Нямянчынскае старості, Вільнюскі раён, Літва
54.906635, 25.319145
www.vrtic.lt
+370 52001646

31

## Музей мансеньёра Юзафа Абрэмбскага

Мансеньёра Юзафа Абрэмбскага (1906–2011) называюць патрыярхам Віленшчыны. Гэта адзін з найстарэйшых каталіцкіх святароў Літвы і Еўропы. Ён пражыў ажно 105 гадоў! Увесь час ён не толькі клапаціўся пра духоўнае жыццё прыхаджан, але і дапамагаў святарам, якія ўцякалі ад бальшавікоў, і тым, хто вяртаўся з сібірскай ссылкі. Падчас нацысцкай акупацыі ён нават выратаваў некалькі вёсак ад знішчэння. Апошнім жаданнем мансеньёра Абрэмбскага было стварэнне месца памяці аб усіх святарах і манахах, якія трапілі пад пераслед, але неслі веру і не баяліся за сваё жыццё. Наведвальнікі музея пазнаёмяцца з дзейнасцю гэтага выдатнага чалавека і даведаюцца пра функцыянаванне каталіцкай царквы ў савецкі час. Дзяцей тут чакаюць розныя гульні і цікавыя заданні.

вул. Шв. Антано, 5, Майшагала,
Вільнюскі раён, Літва
54.869240, 25.065837
www.vrtic.lt
+370 60184102





32

## Касцёл Благаслаўлёнага Міхала Сапоцькі

Касцёл імя Благаслаўлёнага Міхала Сапоцькі (1888–1975) – першы і адзіны ў свеце (да гэтага часу) касцёл, які носіць імя гэтага святога. Ксёндз Міхал Сапоцька – з ліку тых асоб, якія здзейснілі вялікія справы і засталіся ў гісторыі Віленшчыны. Ён стаў адным з тых, хто быў благаслаўлёны і кананізаваны царквой, тых, хто пакінуў яскравы след у гісторыі Каталіцкай Царквы. Міхал Сапоцька быў святаром Віленскай архідыяцэзіі, прафесарам універсітэта Стэфана Баторыя і капеланам арміі, спавядальнікам кананізаванай Марыі Фаўсціны Кавальскай і нястомным Апосталам Божай Міласэрнасці. Госці могуць наведаць царкву і магілкі, дзе пахаваныя манахіні Кангрэгацыі сясцёр-урсулінак.

вул. Шв. Уршулес, 25, Юодшыляй,
Вільнюскі раён, Літва
54.582873, 25.259611
www.vrtic.lt
+370 52436402



33

## Музей Уладзіслава Сыракомлі

У невялікай вёсцы Барэйкішкес знаходзіцца драўляны будынак, дзе ў 1853–1861 гг. жыў і працаваў паэт У. Сыракомля (1823–1862). У былой драўлянай сядзібе цяпер працуюць Цэнтр турыстычнай інфармацыі Вільнюскага раёна і музей, экспанаты якога распавядаюць пра Уладзіслава Сыракомлю, вядомага літаратара і аўтара першага ў Літве турыстычнага даведніка. Выдаўцы канкурыравалі за права першымі надрукаваць яго новыя вершы, а часам нават плацілі 1/2 рубля – добрыя грошы для таго часу. Госці музея ўбачаць тут мэблю, партрэты, кнігі і іншыя асабістыя рэчы паэта, змогуць паслухаць лекцыі пра паэзію або наведаць заняткі па каліграфіі.

вул. Сыракомлес, 5, Барэйкішкес,
Вільнюскі раён, Літва
54.616530, 25.463377
www.vrtic.lt
+370 52436402

35

## Капліца Святога Ігната ў Прычунаі

Капліца была пабудавана ў 1837 годзе і славіцца сваім храмавым святам, якое праводзіцца ў канцы ліпеня ў гонар заступніка гэтай зямлі, св. Ігната, і збірае шмат пілігрымаў.
Таблічка над уваходам у капліцу нагадвае пра важныя гістарычныя факты. Адна з таблічак устаноўлена ў гонар Ванды Банішэўскай, манахіні Кангрэгацыі Сясцёр Анёлаў, якая пражыла ў Прычунаі амаль 20 гадоў і была ўшанаваная прыхаджанамі за падтрымку пераследаваных і за нястомную апостальскую дзейнасць. Калі адкрыліся стыгматы, манахіня атрымала дар прароцтва і лячэння верай.
Другая манахіня, сястра Алена Маеўска, атрымала вялікае прасвятленне ў сваім жыцці – Аб'яўленне Езуса. Неўзабаве яна разам з Міхалам Сапоцькам, які быў Апосталам Божай Міласэрнасці, заснавалі новую кангрэгацыю сясцёр Міласэрнага Езуса.

вёска Прычунай,
Буйвіджайскае староства,
Вільнюскі раён, Літва
54.842315, 25.642564
www.vrtic.lt
+370 52436402

www.vrtic.lt

# ГОРАД ПОЛАЦК І ПОЛАЦКІ РАЁН




36

## Помнік мегалітычнай культуры «Беларускі Стоўнхэндж»

Беларускі Стоўнхэндж на возеры Янова з'яўляецца ўнікальным помнікам мегалітычнай культуры. Яго называюць яшчэ старажытнай абсерваторыяй, пра што сведчаць асаблівым чынам размешчаныя камяні, якія на працягу




года паказваюць на месца заходу Сонца ў найбольш важных кропках яго нябеснага руху – сонцастаяння і раўнадзенства. Наведаць яго можна ў любую пару года як самастойна, так і замовіўшы экскурсію, падчас якой удасца даведацца пра тое, як вызначалі час нашы продкі, паспрабаваць свае сілы ў тлумачэнні старажытнага календара. Дабрацца да помніка можна як сухапутным шляхам – круглы год, так і водным – летам на байдарках.

вёска Бікульнічы, Полацкі раён,
Віцебская вобласць Беларусь
55.273735, 28.782634

www.polotsk-turizm.com
+375 214466949

37

## Знак «Геаграфічны цэнтр Еўропы»

Полацк – не толькі адзін з самых старажытных славянскіх гарадоў, але і геаграфічны цэнтр Еўропы. Многія гарады прэтэндуюць на гэты статус: дакладнае размяшчэнне геаграфічнага цэнтра Еўропы складана ўказаць адназначна, бо вызначаецца гэта абранай методыкай падліку. Але, як і стагоддзі таму назад, Полацк быў і ёсць зыходнай кропкай еўрапейскіх дарог, беларускім сэрцам Еўропы. Знак, які пацвярджае гэта, размешчаны на галоўным праспекце горада.

пр. Ф. Скарыны, г. Полацк,
Віцебская вобласць, Беларусь
55.484737,28.776064

www.polotsk-turizm.com
+375 214466949




38

## Прыватны музей рыцарства

Наведвальнікі музея маюць унікальную магчымасць дакрануцца да сярэднявечнай гісторыі: прымераць даспехі, пастраляць з лука, развучыць старадаўнія танцы.

Падчас праграмы «У старажытным замку» князь Андрэй Альгердавіч падзеліцца сакрэтнымі ведамі пра рыштунак воінаў IX – XIV ст., раскажа пра палітычныя падзеі апошняй чвэрці XIV ст., якія змянілі гісторыю старажытнага Полацка – аднаго з галоўных гарадоў Усходняй Еўропы, які ўваходзіў у склад Вялікага Княства Літоўскага.

вул. Энгельса, 3, г. Полацк,
Віцебская вобласць, Беларусь
55.484299, 28.771851

www.polotsk-turizm.com
+375 298345566




39

## Творчая лабараторыя «Полацкая друкарня»

Унікальнай для ўсёй Беларусі з'яўляецца асоба Францішка Скарыны (першая палова XVI ст.) – палачаніна, друкара, які першым выдаў кнігу на беларускай мове. Прызнаннем высокіх заслуг з'яўляецца размяшчэнне яго партрэта ў «Зале сарака» Падуанскага ўніверсітэта. Падчас праграмы «У друкара» кожны зможа адчуць сябе майстрам друкаванага слова, дакрануцца да таямніц стварэння кнігі: выкласці шрыфтамі ўласны тэкст і надрукаваць сваю першую старонку на сапраўдным станку эпохі Адраджэння, самастойна зрабіць гравюру святой Полацкай Сафіі.

вул. Энгельса, 3, г. Полацк, Віцебская вобласць, Рэспубліка Беларусь
55.484299, 28.771851

www.polotsk-turizm.com
+375 297162670



40

### Анімацыйная экскурсія на дракары

Асабліва яркай у гісторыі Полацкай зямлі з’яўляецца эпоха Сярэднявечча: горад у той час славіўся сваімі рамеснікамі, гандлярамі і, вядома, воінамі. Падчас гадзіннай экскурсіі па Заходняй Дзвіне на дракары госці горада даведаюцца, як нашы продкі будавалі самыя быстраходныя судны – дракары, пазнаёмяцца з жыццём славян і вікінгаў, гісторыяй Полацка. Адчуйце сілу ветру, паглядзіце на прыгажосць берагоў Заходняй Дзвіны, вазьміце ў рукі меч, уявіце сябе воінам на старажытным дракары!

пр. Ф. Скарыны, 8, г. Полацк, Віцебская вобласць, Рэспубліка Беларусь
55.485158, 28.766435
www.polotsk-turizm.com
+375 214466949

41

### Памятны знак аб гістарычным і культурным развіцці Полацка

Веліч і прыгажосць Полацка розных эпох застылі ў камені: лукавіна ракі Палаты, якая дала назву гораду, легендарны востраў, дзе калісьці быў кляштар, і шырокавядомы «карабель» Сафійскага сабора на Верхнім замку. Кожны наведвальнік можа агледзець панараму старажытнага горада і дакрануцца да яго гісторыі.

Гістарычная частка горада Полацка, цэнтральная алея па пр. Ф. Скарыны
55.484998, 28.771420
www.polotsk-turizm.com
+375 214466949

www.polotsk-turizm.com

40



Гэта брашура падрыхтавана для праекта ENI-LLB-1-108 «Павышэнне канкурэнтаздольнасці і ўстойлівасці турызму ў сферы культуры, садзейнічанне захаванню, даступнасці і развіццю нематэрыяльнай культурнай і гістарычнай спадчыны ў Латвіі, Літве і Беларусі» Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія-Літва-Беларусь у рамках Еўрапейскага інструмента суседства на 2014-2020 гг. (Rediscover the roots of regions), якая накіравана на садзейнічанне захаванню, даступнасці і развіццю нематэрыяльнай культурнай і мясцовай гістарычнай спадчыны шляхам павышэння ўстойлівай канкурэнтаздольнасці культурнага турызму ў Латвіі, Літве і Беларусі.

Агульны бюджэт праекта – 1 031 590,97 еўра (2 425 786,17 беларускіх рублёў). Уклад Еўрапейскага Саюза (90%) – 928 431,87 еўра (2 183 207,54 беларускіх рублёў).
Праграма трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія-Літва-Беларусь у рамках Еўрапейскага інструмента суседства на 2014-2020 гг. спрыяе сінергетычнаму партнёрству латвійскіх, літоўскіх і беларускіх арганізацый пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. Стратэгічная мэта Праграмы – умацаванне адносін, павышэнне патэнцыялу і абмен вопытам паміж людзьмі і арганізацыямі шляхам рэалізацыі сумесных дзеянняў, накіраваных на павышэнне агульнай якасці жыцця ў прыгранічных рэгіёнах. Фінансаванне ЕС для Праграмы складае 74 мільёны еўра.

Дзяржавы-члены Еўрапейскага Саюза вырашылі паступова злучыць свае ноу-хау, рэсурсы і лёсы. Сумесна яны стварылі зону стабільнасці, дэмакратыі і ўстойлівага развіцця, захоўваючы пры гэтым культурную разнастайнасць, памяркоўнасць і павагу да асабістай свабоды. Еўрапейскі Саюз бярэ на сябе абавязацельства дзяліцца сваімі дасягненнямі і каштоўнасцямі з краінамі і народамі, якія знаходзяцца за яго межамі.

Гэта брашура фінансуецца Еўрапейскім Саюзам. Гэта брашура была падрыхтавана пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. Яе змест з’яўляецца выключнай адказнасцю Зэмгальскага плініровачнага рэгіёна і не з’яўляецца адлюстраваннем афіцыйнай пазіцыі Еўрапейскага Саюза.

Мы дзякуем партнёрам па праекце за супрацоўніцтва: аддзелу спорту і турызму Полацкага раённага выканаўчага камітэта, муніцыпалітэту Нэрэцкага краю, муніцыпалітэту горада Екабпілса, Рэгіянальнаму музею горада Рокішкіса, муніцыпалітэту Вільнюскага раёна, уладальнікам аб’ектаў і пастаўшчыкам турыстычнай інфармацыі Зэмгальскага рэгіёна і Полацкага раёна, якія ўдзельнічалі ў стварэнні выдання.

Гэтая праграма фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

ЛАТВІЯ ЛІТВА БЕЛАРУСЬ 2014-2020

**Выдавец:** Зэмгальскі плініровачны рэгіён, www.zemgale.lv, 2021
**Дызайн, макет:** Ёланта Дэге
У брашуры выкарыстаны фотаздымкі латвійскіх, літоўскіх і беларускіх турыстычных інфармацыйных арганізацый, уладальнікаў аб’ектаў, музеяў, Зэмгальскага плініровачнага рэгіёна, аддзела спорту і турызму Полацкага раённага выканаўчага камітэта, муніцыпалітэта Нэрэцкага краю, муніцыпалітэта горада Екабпілса, архіва Рокішкіскага краязнаўчага музея, Муніцыпалітэта Віленскага раёна, рэкламных матэрыялаў дызайнерскага бюро H2E.
Аўтары – Оскар Калныньш, Анрыйс Пажарскіс, Крыстапс Рунцыс.

Глядзі і
шукай іншыя
турыстычныя
маршруты









Латвія I Літва I Беларусь